# НА ШЛЯХУ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАГА
(уступнае слова)

А.К.Лягчылаў, прарэктар па
навукова-творчай рабоце

Тэматыка навукова-практычнай канферэнцыі, якую мы сення адкрываем, дае магчымасць цікава і разнастайна разглядзець пытанні развіцця культуры і мастацтва ў аспекце агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.

Шмат існуе тэорый і поглядаў на ролю і месца нацыі ў развіцці чалавецтва. Не паглыбляючыся ў філасофскія разважанні хочацца толькі адзначыць, што як разнастайна прадстаўлена сама прырода шматлікасцю сваей флоры і фауны, засведчыўшы гэтым сваю арганічнасць і прыгажосць, так і само чалавечае грамадства існуе дзякуючы разнастайнасці, шматаблічнасці тыпаў, псіхалагічных рысаў асобных людзей.

Як і людскія індывідумы ў грамадстве, так і разнастайныя нацыі аб'ядноўваюцца ў грамадстве. Раскрываючы свае своеасаблівае, абмежаванае, кожная нацыя, як і асобны чалавек, прыносіць свае непаўторнае ў скарбонку агульначалавечых ідэалаў.

Сенняшнее жыцце не надта спрыяе грамадскай актыўнасці ва усіх сферах. У кожнага есць свае падставы для сумненняў, роспачы, зніжэння жыццевага тонусу. Але вінаваціць людзей у гэтым не варта. Проста мы станам сваей душы, як у люстэркавым адлюстраванні, паказваем той грамадска-палітычны і дзяржаўны крызіс, які напаткаў нашае грамадства.

Тым не менш на гэтым фоне не затухае іскрынка надзеі на лепшае, мы ўсе больш і больш усведамляем свае месца як нацыя, як часцінка агульначалавечай цывілізацыі, культуры.

А як жа інакай! Кожны беларус павінен ведаць, што есць ягоны народ, якая ў яго гісторыя, якія існуюць асаблівасці нацыі.

Мы часта чуем, - мова - душа народа. Дадайце сюды яшчэ культуру, гістарычную памяць, нацыянальную самасвядомасць. Немагчыма ўявіць культуру любога народа без прыроднай мовы - гэта не культура. Нацыя, якая не мае сваей мовы, вымірае.

Менавіта таму, асабліва апошнія гады, навукоўцы нашага іна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тытута ўсе больш пільна і уважліва падыходзяць да выбару тэматыкі даследванняў, аддаючы перавагу праблемам развіцця нацыянальнай культуры і мастацтва, раскрыцця нацыянальна-гістарычных і сучасных надзенных праблем, такіх як гісторыя філасофскай думкі на Беларусі, псіхалагічныя (ментальныя) асаблівасці беларусаў, тэорыя беларускай культуры і г.д. Цікавыя даследванні праводзяцца на кафедрах беларускай літаратуры, псіхалогіі і педагогікі, нацыянальнай гісторыі, сацыякультурнай дзейнасці, этнаграфіі і фальклору.

Шмат цікавага ў гэтым накірунку мы спадзяемся атрымаць з аднаўленнем дзейнасці лабараторыі танцавальнай творчасці, адкрыццем лабараторыі фальклору.

Спецыфіка нашай навучальнай установы дае магчымасць не абмяжоўваць сваю дзейнасць толькі навуковымі, тэарэтычнымі даследваннямі. Неад'емная, разнахарактарная і цікавая частка навуковай працы ўвасабляецца ў творчай і творчавыканаўчай дзейнасці.

Фальклорныя экспедыцыі, стварэнне на іх матэрыялах новых праграм, апрацоўкі народных песен і танцаў, стварэнне цікавых сцэнарыяў гульняў, святаў, фестываляў, творчыя справаздачы мастацкіх калектываў - далека не поўны пералік усяго таго, што робіцца ў гэтым накірунку. Дадайце сюды яшчэ поспех, якім карыстаюцца нашыя мастацкія калектывы "Валачобнікі", "Спадчына", "Сябрына", эстрадны, духавы, цымбальны аркестры і многія іншыя.

Беларуская мова становіцца часткай жыцця інстытута. За даволі кароткі перыяд на беларускую мову навучання і выхавання студэнтаў перайшло каля 70 выкладчыкаў. На роднай мове выходзяць вучэбна-метадычныя матэрыялы, навуковыя зборнікі. Выдадзены 2 беларускіх слоўніка.

Аб усім гэтым я кажу з задавальненнем не толькі таму, што усведамленне важнасці нацыянальных пытанняў прыйшло сення да кожнага выкладчыка, а перш за ўсе таму, што маладое пакаленне, якое прыходзіць у інстытут за атрыманнем прафесіі, адчувае, што мова беларуская тут у пашане, і ВНУ зможа і стане сапраўднай нацыянальнай вышэйшай навучальнай установай культуры і мастацтва.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ